НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

УДК 882. 6 – 1 "20" (043.3)

**ЛАПАЦІНСКАЯ ВОЛЬГА ВІКТАРАЎНА**

# ТВОРЧАСЦЬ АНАТОЛЯ СЕРБАНТОВІЧА Ў ПАЭТЫЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ КАНЦА 50-х–60-х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ: ВОБРАЗНА-СТЫЛЯВАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ

**10.01.01 – беларуская літаратура**

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

**Мінск – 2005**

Праца выканана ва ўстанове адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”

Навуковы кіраўнік — доктар філалагічных навук, прафесар
**М.І. Мішчанчук,**
установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”,
кафедра беларускага літаратуразнаўства

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук
**М.А. Тычына,**
Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, аддзел тэорыі літаратуры

кандыдат філалагічных навук, дацэнт
**М.П. Кенька,**
Беларускі дзяржаўны універсітэт,
кафедра тэорыі літаратуры

Апаніруючая арганізацыя – установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

Абарона адбудзецца “ 9 ” лістапада 2005 года ў 14.20 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.41.01 пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (220072, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 66, тэл. 284-28-87).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (г. Мінск, вул. Сурганава, 15).

Аўтарэферат разасланы “ 4 ” кастрыч. 2005 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар філалагічных навук Г. Кісялёў *Г.В. Кісялёў*

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Актуальнасць дысертацыі абумоўлена тым, што да гэтага часу не створана шырокая, аб'ектыўная карціна літаратурнага працэсу канца 50-х – 60-х гадоў – значнага і адметнага перыяду ў развіцці беларускага слоўнага мастацтва. Недастаткова даследавана і творчасць так званага філалагічнага пакалення, якое вызначылася менавіта ў гэты пераломны час; па-за ўвагай літаратуразнаўцаў засталіся некаторыя арыгінальныя постаці, адсутнічаюць манаграфіі пра іх шлях у літаратуры, іх набыткі ў кантэксце літаратурнага руху XX ст. Навукова-метадалагічны і тэарэтычны ўзровень развіцця сучаснага літаратуразнаўства вымагае глыбокага і ўсебаковага вывучэння творчасці кожнага самабытнага пісьменніка і вызначэння належнага яму месца ў літаратурным працэсе. Да ліку абыдзеных увагай таленавітых постацей можна аднесці і прадстаўніка філалагічнага пакалення, малодшага паплечніка Р. Барадуліна, У. Караткевіча, А. Вярцінскага – Анатоля Сербантовіча, паэта вострасацыяльнага, які, пераадольваючы ідэалагічныя забароны, пратэставаў супраць прыгнечання асобы ў тагачасны перыяд канфармісцкай грамадскай псіхалогіі, абараняў вечныя каштоўнасці чалавечага жыцця.

Зварот да абранай тэмы выкліканы патрэбаю ліквідацыі белых плямаў на карце літаратуры, сістэматызацыі матэрыялаў, прысвечаных аднаму з найбольш арыгінальных беларускіх паэтаў-шасцідзесятнікаў, раскрыцця жанравай шматграннасці, асаблівасцей індывідуальнай манеры пісьма паэта, вобразнай адметнасці і мастацкіх пошукаў у кантэксце творчасці яго равеснікаў – У. Нядзведскага, В. Макарэвіча, М. Маляўкі і інш. Без вырашэння гэтай задачы цяжка стварыць поўнае ўяўленне аб заканамернасцях і асаблівасцях развіцця беларускай літаратуры ў 60-я гады XX стагоддзя і ў другой яго палове ў цэлым.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Тэма дысертацыі адпавядае перспектыўным планам і навуковым праграмам каардынацыйнага савета Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, была зацверджана і затым скарэктавана на пасяджэннях Савета УА "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава" (пратаколы №2 ад 2.09.2000 г., №3 ад 28.11.2004 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыйнай працы з'яўляецца даследаванне эвалюцыі творчасці Анатоля Сербантовіча ў кантэксце літаратурнага працэсу канца 50-х – 60-х гадоў, цэласнае апісанне набыткаў паэта, выяўленне жанравай і стылявой адметнасці яго спадчыны. У адпаведнасці з мэтай даследавання ставяцца і вырашаюцца наступныя задачы:

- прааналізаваць і сістэматызаваць крытычны і літаратуразнаўчы матэрыялы аб жыцці і творчасці Анатоля Сербантовіча;
- прасачыць станаўленне і развіццё светапогляду і светаўспрымання А. Сербантовіча і на гэтай аснове асэнсаваць эвалюцыю яго лірычнай творчасці;

Нацыянальна бібліятэ...

- разгледзець паэзію Анатоля Сербантовіча ў кантэксце літаратурнага працэсу канца 50-х — 60-х гадоў, творчасці прадстаўнікоў філалагічнага пакалення;
- шляхам сістэмнага аналізу найбольш характэрных вершаў паэта вызначыць агульныя заканамернасці яго творчасці, абумоўленыя як аб'ектыўнымі, так і суб'ектыўнымі фактарамі;
- паказаць шматграннасць жанравых пошукаў паэта ў параўнанні з агульнай тэндэнцыяй пошукаў прадстаўнікоў яго пакалення;
- даследаваць колеравую палітру паэзіі А. Сербантовіча; паказаць поліфункцыянальнасць яго тропаў (метафар, параўнанняў) на фоне дасягненняў паэтаў–равеснікаў;
- раскрыць ролю такіх прыёмаў паэтычнага сінтаксісу, як інверсія і рытарычныя фігуры, у станаўленні стылю паэта на фоне эксперыментальных паэтычных пошукаў Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, В. Макарэвіча, У. Нядзведскага, Я. Сіпакова і інш.;
- абгрунтаваць канцэпцыю пра сінтэтычны характар індывідуальнага стылю паэта, удалае спалучэнне адзнак рамантычнага і рэалістычнага пісьма, сінкрэтызм лірычнага, эпічнага і драматургічнага пачаткаў у яго творчасці.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца творчасць Анатоля Сербантовіча ў кантэксце паэзіі другой паловы XX стагоддзя.

Прадмет даследавання — стылявая адметнасць і жанравая разнастайнасць спадчыны А. Сербантовіча, эвалюцыя мікравобразных сродкаў у зборніках “Азбука”, “Міннае поле”, “Пярсцёнак” у тыпалагічным супастаўленні з паэзіяй Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, В. Макарэвіча і іншых аўтараў.

**Матэрыял даследавання.** Матэрыялам даследавання паслужыла паэзія канца 50-х – 60-х гадоў XX ст.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічная аснова дысертацыі грунтуецца на вывучэнні прац айчынных, рускіх і замежных навукоўцаў: М. Арочкі, М. Барсток, А. Бельскага, В. Бечыка, Р. Бярозкіна, Ю. Борава, П. Вайля, В. Ванслоў, Т. Галаванавай, А. Геніс, Л. Гінзбург, У. Гніламёдава, І. Грынберга, В. Жураўлёва, У. Жырмунскага, В. Каваленкі, В. Кожынава, У. Конана, А. Лойкі, А. Лосева, Ю. Лотмана, М. Мішчанчука, І. Навуменкі, У. Огнева, А. Паўлоўскага, Г. Паспелава, В. Рагойшы, М. Тычыны, О. Уорэна, А. Урбана, Р. Уэлека, В. Халізева, А. Яскевіча і інш.). Даследаванне абапіраецца на філасофска-эстэтычныя і літаратурна-крытычныя канцэпцыі Арыстоцеля, І.В. Гётэ, А. Камю, Р. Барта з прыцягненнем сучасных дасягненняў сумежных навуковых галін.

Аўтар дысертацыі карыстаецца функцыянальна-гістарычным, тыпалагічным, герменеўтычным метадамі з шырокім выкарыстаннем прыёму статыстычнага аналізу літаратурных фактаў і з'яў.

**Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што ў дысертацыі:

- упершыню творчасць, жанравыя і стылявыя асаблівасці паэзіі Анатоля Сербантовіча сталі прадметам цэласнага манаграфічнага вывучэння;

- аналіз набыткаў мастака праводзіцца ў двух аспектах – тэарэтычным і пошукава-даследчым – з распрацоўкай уласных методык і выкарыстаннем прыёмаў варыяцыйна-статыстычнага абследавання эмпірычнага матэрыялу;
- упершыню творчасць таленавітага мастака слова паказваецца як значны складнік агульных поспехаў і дасягненняў яго пакалення, што дае магчымасць вызначыць характэрныя рысы аблічча пісьменнікаў-шасцідзесятнікаў у літаратурным працэсе ў цэлым;
- грунтоўна даследавана паэтыка жанраў, колеравай сінестэзіі, тропікі і рытміка-інтанацыйнай структуры твораў Анатоля Сербантовіча ў кантэксце тыпалагічных сыходжанняў з паэзіяй Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, У. Караткевіча, В. Макарэвіча, У. Нядзведскага, Я. Сіпакова, што таксама праароблена ўпершыню ў айчынным літаратуразнаўстве.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў** заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецкурсаў і спецсемінараў аб заканамернасцях літаратурнага працэсу канца 50-х–60-х гадоў XX стагоддзя, пры напісанні вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для ВНУ і сярэдніх навучальных устаноў, адрасаваных студэнтам-філолагам і старшакласнікам.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. Паэзія канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя характарызавалася імкненнем пісьменнікаў да абнаўлення зместу і формы, актыўнага пераадолення ілюстрацыйнасці і спрошчанасці ў даследаванні з'яў рэчаіснасці пераломнага перыяду. У гэты час значна ўзрастае творчая актыўнасць мастакоў слова і больш адкрытым, выразным, акрэсленым робіцца іх разуменне ідэйна-зместавых задач словатворчасці. Новы ракурс набывае інтэрпрэтацыя праблемы "чалавек і грамадства", якая раскрываецца ў адпаведнасці з сусветнай гуманістычнай традыцыяй, заснаванай на культе ідэі свабоды, унікальнай каштоўнасці чалавечай асобы. Адзначаныя фактары паспрыялі паскоранаму станаўленню арыгінальных творчых індывідуальнасцей.

2. Адной з вядучых тэндэнцый літаратурнага працэсу канца 50-х–60-х гадоў становіцца аналітызм, выкліканы не толькі пашырэннем прадмета мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, выхадам мастацтва слова за межы сацыяльна-вытворчай тэматыкі, але і паглыбленнем псіхалагізму ў ім, узрослай інтэлектуальнай культурай творцаў прыгожага.

3. Творчасць Анатоля Сербантовіча стала адбіткам свайго часу – неспакойнага, адзначанага вялікімі пераменамі ў грамадскім жыцці адлюжнага дзесяцігоддзя. Лірычны герой яе – Асоба неардынарная, адкрытая, сумленная, якая глыбока разумее і востра перажывае канфлікты рэчаіснасці. Неадпаведнасць слова і справы, сацыяльная мімікрыя былі ненавісныя паэту і яго герою, таму ад першага ("Азбука") да апошняга ("Пярсцёнак") зборнікаў назіраецца нарастанне трагедыйнага пафасу. Нярэдка матывы расчаравання, недаверу, роспачы роздум пачынаюць пераважаць, што ў цэлым "фарміруе" стыль, жанры, вобразную палітру спадчыны таленавітага аўтара.

4. Аналіз тропаў А. Сербантовіча выразна паказаў, што ад "Азбукі" да "Пярсцёнка" стыль паэта прыкметна мяняўся: станавіўся ўсё больш сінтэтычным, спалучаў у сабе рэалістычныя, рамантычныя і часткова мадэрнісцкія адзнакі пісьма, з яўнай перавагай двух апошніх. Падобным быў і рух паэзіі Я. Сіпакова і В. Макарэвіча, у большай ступені захапляўся эмацыянальным, метафарычным эксперыментам Р. Барадулін, фарміравалі нашу "паэзію думкі" А. Вярцінскі, У. Нядзведскі.

5. Імпрэсіяністычная колеравая палітра А. Сербантовіча сведчыла аб глыбокім рамантычным светаўспрыманні паэта, што, у прыватнасці, пацвярджаецца дамінаваннем у ёй у першую чаргу сіне-белых фарбаў. Паступова стыль паэта эвалюцыянуе ў бок павелічэння ролі асацыятыўнай вобразнасці, што вядзе да спалучэння знешняга і ўнутранага, рэчыўнага і абстрактнага, гармоніі цёмнага і светлага пачаткаў у другім і трэцім зборніках.

6. Стыль паэта ад зборніка да зборніка пазбаўляўся дэкларацыйнай гучнасці, паступова рабіўся цішэйшым, знешняя эфектацыя замянялася медытатыўнасцю, адрывістая дыялогавасць — экзістэнцыяльнай маналагічнасцю. Такая тэндэнцыя пацвярджаецца аналізам асаблівасцей паэтычнага аўтарскага сінтаксісу (канцэнтраванае выкарыстанне інверсій, рытарычных фігур). Адзначанымі рысамі эксперыментальна ён набліжаўся да стылю У. Караткевіча і А. Вярцінскага.

7. Жанравы дыяпазон творчасці мастака слова надзвычай разнастайны. Паэзія яго прадстаўлена одай, элегіяй, баладай, санетам у іх разнастайных сучасных мадыфікацыях. Агульнай тэндэнцыяй творчасці А. Сербантовіча і яго аднагодкаў становіцца працэс жанравага сінтэзу як вынік кантактнасці лірыкі, эпасу і драмы, іх жанрава-родавай дыфузіі.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыйная праца выканана самастойна, без сааўтараў, на аснове пашырэння даследчай базы за кошт увядзення новага, малавядомага фактычнага матэрыялу па творчасці паэта, выкарыстання сучасных канцэпцый айчыннага і замежнага літаратуразнаўства.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыя ў працэсе напісання і ў поўным аб'ёме абмяркоўвалася і была рэкамендавана да абароны на пасяджэнні кафедры беларускай літаратуры УА "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава" (пратакол № 4 ад 1.11.2004 г.). Асноўныя яе палажэнні і высновы прайшлі апрабацыю на наступных ***канферэнцыях***: 1) Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Традиционное и новаторское в преподавании литературы в школе и вузе" (Брэст, 20 – 21 лістапада 2001 г.); 2) VII (54) навуковай сесіі выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава (Віцебск, 5 – 6 лютага 2002 г.); 3) Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Творчасць Аркадзя Куляшова і адукацыйна-асветніцкія праблемы сучаснасці" (Куляшоўскія чытанні) (Магілёў, 6–7 лютага 2002 г.); 4) VI (51) навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў "Молодёжь и наука: новые ступени роста" (итоги НИР – 2001) (Віцебск, 22–23 мая 2002 г.); 5) Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Янка Купала і еўрапейскі

літаратурны працэс” (VI Купалаўскія чытанні) (Мінск, 4–5 ліпеня 2002 г.); 6) Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Мир романтизма” (X Гуляевские чтения) (Цвер, 12 – 15 верасня 2002 г.); 7) Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Максім Танк і сучасны літаратурны працэс” (Мінск, 17 – 18 верасня 2002 г.); 8) Міжнароднай навукова-тэарэтычный канферэнцыі “Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур” (Мінск, 3–4 кастрычніка 2002 г.); 9) VII Рэспубліканскай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларусі (НДРС 2002) (Наваполацк, 20 – 21 лістапада 2002 г.); 10) Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі “Наша класіка: традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе” (Брэст, 23–24 снежня 2002 г.); 11) VI міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае моваэнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія” (Віцебск, 15–17 мая 2003 г.); 12) V міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі маладых вучоных (Брэст, 29 – 30 мая 2003 г.); 13) Міжнароднай канферэнцыі “Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце” (IV навуковыя чытанні да 210-годдзя з дня нараджэння) (Віцебск, 18 – 19 мая 2004 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання.** Асноўныя палажэнні і навуковыя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 16 публікацыях, напісаных без сааўтараў, сярод якіх 4 – навуковыя артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях, 12 — матэрыялы выступленняў на міжнародных, рэспубліканскіх, галіновых канферэнцыях. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў – 84 старонкі (4,3 друк. арк.).

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, сямі параграфаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц, 12 дадаткаў на 76 старонках. Агульны аб’ём дысертацыі складае 203 старонкі; 111 с. займае асноўны тэкст, у які ўключаны 8 табліц (11 с.) і 3 малюнкі (4 с.). Спіс выкарыстанай літаратуры змяшчае 277 пазіцый і займае 15 с.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **“Уводзінах”** акрэсліваецца ступень раскрыцця тэмы даследавання ў айчынным літаратуразнаўстве, абгрунтоўваецца яе актуальнасць, якая абумоўлена наступнымі фактарамі. Па-першае, праблема месца і ролі кожнага творчага пакалення ў літаратурным працэсе заўсёды з’яўляецца адной з прыярытэтных, паколькі дае сучасным літаратуразнаўцам падставы па-новаму ацаніць літаратурны рух у цэлым. Па-другое, літаратура канца 50-х – 60-х гадоў – гэта вялікі пласт сучаснага слоўнага мастацтва, без ацэнкі якога літаратурны працэс мінулага стагоддзя выглядае не да канца раскрытым і збедненым. Па-трэцяе, спрэчкі вакол творчай генерацыі пісьменнікаў перыяду “адлігі” не сціхаюць і да сённяшняга дня, іх творчы эксперымент істотна ўплываў на агульны рост мастацкай культуры ў цэлым. Па-чацвёртае, творчасць і асоба Анатоля Сербантовіча, – яркага прадстаўніка плеяды паэтаў-шасцідзесятнікаў, усё яшчэ застаюцца недаравальна абыдзенымі, недастаткова вывучанымі. Асэнсаванне спадчыны А. Сербантовіча дазваляе

па-новаму падаць шматколерную панараму літаратурнага працэсу, больш поўна выявіць тэндэнцыі і заканамернасці грамадскага і культурнага жыцця эпохі канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя.

У першым раздзеле – **“СПЕЦЫФІКА ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ КАНЦА 50-х – 60-х ГАДОЎ XX СТАГОДДЗЯ”** – даследуюцца вызначальныя асаблівасці літаратурнага працэсу перыяду “адлігі”, іх праявы ў сацыяльна-грамадскім і духоўным жыцці, раскрываецца агульная эвалюцыя творчасці Анатоля Сербантовіча.

У параграфе **1.1. “Грамадска-культурная сітуацыя і асноўныя тэндэнцыі развіцця літаратуры канца 50-х – 60-х гадоў”** дадзена характарыстыка гэтага своеасаблівага перыяду ў гісторыі беларускага народа і адметнага этапа літаратурнага працэсу. Адзначаецца, што характэрнай рысай развіцця паэзіі 60-х гадоў з’яўляецца грамадзянская пісьменніцкая служба і творчае суразмоўе-спаборніцтва прадстаўнікоў двух пакаленняў: старэйшага – ахвяр сталінскіх рэпрэсій і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і малодшага, дзіцячыя гады якога супалі з ваенным часам і якое было народжана новымі абставінамі.

У якасці дамінанты, якая вызначае аблічча грамадскага і культурнага развіцця разгледжанага перыяду, выступае ідэя гуманізму. У непарыўнай сувязі з гэтым знаходзіцца і актуалізацыя праблемы “чалавек і грамадства”, вызначальнасць у літаратуры канца 50-х – 60-х гадоў матыву свабоды, што выявіўся ў беларускай рамантычна настроенай паэзіі акрэсленага перыяду праз лермантаўскія традыцыі, яскравым прыкладам арыгінальнай інтэрпрэтацыі якіх якраз і з’яўляецца лірыка Анатоля Сербантовіча.

Асаблівая ўвага ў першым параграфе надаецца функцыянаванню ў літаратурным працэсе 60-х гадоў рамантычнай жанрава-стылявой тэндэнцыі. Яе асвятленне цесна звязваецца з праблемай наследавання ў перыяд “адлігі” традыцый, выпрацаваных усходнеславянскім класічным рамантызмам першай трэці XIX ст. і “неарамантызмам” у беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя.

Тэма вёскі ў паэзіі другой палове 60-х гадоў была вядучай у творчасці як беларускіх, так і рускіх аўтараў. Менавіта яе раскрыццё (“касмічны вектар”) выявіла адрозненне твораў беларускіх і рускіх аўтараў, якое ўмоўна можна паказаць двума трохвугольнікамі. Вектар прадстаўлены ў рускай літаратуры як перавернуты вяршыняй уніз, з шырокіх абсягаў у кропку да вытокаў, да тэмы бацькоўскага парогу, трохвугольнік. Падобны рух абумовіў “феномен Рубцова” і “ціхай лірыкі” ў сярэдзіне 60-х гадоў, заснаваных на засваенні традыцый рускага класічнага верша, мастацкіх набыткаў Я. Баратынскага, Ф. Цютчава, М. Забалоцкага, А. Твардоўскага. Аднак парадокс развіцця рускай літаратуры савецкага перыяду заключаецца ў тым, што паступовае яе збліжэнне з вясковымі вытокамі ішло праз спробы адмаўлення ад іх (напрыклад, доўгае і ўпартае непрыняцце паэзіі С. Ясеніна, руская ідэя якога лічылася нават крамольнай).

Беларуская літаратура пра жыццё вёскі (ды і ў цэлым) можа быць прадстаўлена звычайным трохвугольнікам, вяршыня якога сягае ў касмічныя

абсягі. Касмічны вектар браў у ёй свой кірунак на ўстаноўленай са старажытных часоў традыцыі знізу, ад бацькоўскага парога, ад ідэі, якая працавала на праблему захавання нацыянальных каранёў. Яна і стала асновай так званай "вясковай традыцыі" беларускай літаратуры.

Аксіялагічны аспект грамадска-культурнай прасторы 60-х гадоў паслужыў прычынай паглыблення аналітызму ў літаратуры, што ў сваю чаргу паўплывала на яе раскаваную жанравую трансфармацыю.

Другая палова 60-х гадоў мінулага стагоддзя адзначана спадам рамантычнага настрою ў паэзіі і прозе. Метажанрам гэтага перыяду з'яўляецца элегія, якая прыйшла на змену одзе. Прамоўніцкія, публіцыстычныя дыялогі і маналогі, эталагічныя творы канца 50-х — сярэдзіны 60-х гадоў замяняюцца маналогамі-споведзямі, разважаннямі пра вечныя тэмы жыцця і смерці, спакою і хвалявання, шчасця і бяды, пакорлівасці і пратэсту. Але яны па-ранейшаму насычаны яркімі рамантычнымі вобразамі, адметна расквечанымі тропамі.

Адзначаныя асаблівасці сталі асновай творчасці плеяды маладых літаратараў, пакалення, якое прынята называць "філалагічным" ці "шасцідзесятнікамі", і Анатоля Сербантовіча ў тым ліку.

У параграфе **1.2. "Станаўленне Анатоля Сербантовіча – мастака: агульная эвалюцыя творчасці паэта"** адзначаецца, што паэзія Анатоля Сербантовіча ўяўляе сабой яскравы, вобразны адбітак 60-х гадоў, з'яўляецца адпаведнікам эпохі перыяду "адлігі" і пачатку "застою".

Спадчыну А. Сербантовіча складаюць чатыры зборнікі лірыкі: "Азбука" (1966), "Міннае поле" (1968) (выйшлі яшчэ пры жыцці паэта), і "Пярсцёнак" (1971), "Жаваранак у зеніце" (1989), што ўбачылі свет пасля яго смерці.

У параграфе падрабязна аналізуюцца вершы "Нямыя размаўляюць пальцамі", "Пігмеі", "Маскі", якія ўвайшлі ў зборнік "Азбука". Адзначаецца, што безумоўнай заслугай Анатоля Сербантовіча стала з'яўленне ўжо ў першай кнізе глыбокіх, вастрапраблемных, сацыяльна-прарочых твораў, такіх, як "Вакуум", "Чайка", "Я памыліўся...". Пазіцыя мастака слова была блізкая ў гэты час да пазіцыі многіх паэтаў – яго равеснікаў.

Другое месца па колькасці ў зборніку "Азбука" займаюць творы ваеннай тэматыкі. Аналізуюцца вершы "Шырокія дарогі і вялікія..." (падобны па сіле ўздзеяння на верш Максіма Танка "Асвянцім"), "Балада пра ўзараную зямлю".

Творчасці Анатоля Сербантовіча ўжо на першым этапе ўласцівая філасафічнасць, з іх праграмныя вершы "Калі праменнямі азалацілася...", "Ля сабора ў сталіцы", апошні сваёй ідэйнай накіраванасцю мае тыпалагічную сувязь з творам Я. Еўтушэнкі "Кар'ера" і інш. На раннім этапе паэзія Анатоля Сербантовіча бунтарная, рамантычна-акрыленая і адначасова засяроджаная на трагедыйных праблемах існасці. Лірычны герой адрозніваецца чысцінёй думак, пачуццяў і паводзін, вастрынёй адчування гісторыі і часу, вызначаецца адказным стаўленнем да створанага, верай у будучыню.

Зборнік "Міннае поле" адкрыў новы этап у далейшым станаўленні творчага "я" Анатоля Сербантовіча. У параўнанні з першым зборнікам ён ідэйна і кампазіцыйна больш прадуманы і дасканалы з боку паэтычнай

тэхнікі. Кніга адкрываецца аднайменнай паэмай – творам філасофска-рамантычным, насычаным вобразамі-сімваламі, цэнтральны з якіх, вынесены ў загаловак, зрабіўся ідэйна-кампазіцыйнай дамінантай творчасці паэта. Матыў міннага поля-памяці паэт разгортвае, карыстаючыся рамантычнымі стылявымі сродкамі, і ў такіх творах ваеннай тэматыкі, як “Балада”, “Вёска Гута…”, “Гул баёў…”, “Трэці надпіс”, “Крыжы”.

Грамадзянскую лінію першай кнігі Анатоль Сербантовіч развіваў у такіх вершах, як “Голуб устрывожаны, пясмелы...”, “Сляпыя коні”, “Ваўчыца”, “Раса скацілася з куста...”, у паэме “Абвал”, напісаных у рамантычным духу Янкі Купалы.

Вялікае месца сярод апісальна-выяўленчай лірыкі ў зборніку “Міннае поле” займаюць пейзажныя медытатыўныя вершы, у параўнанні са зборнікам “Азбука” іх колькасць значна ўзрастае, павышаецца ўзровень, становіцца больш вытанчаным пачуццё мастацкай меры. Імпрэсіяністычным адчуваннем зменлівасці прыроды кранаюць эцюды “Ад першай да апошняй паласы...”, “Ліхтар”, “Асенні эцюд”, “Марскія кулікі”, “Белая кніга”, “Растуманіліся хмары...” і інш. Адносіны чалавека і прыроды паказваюцца ў вершах “Горы сінія...”, “Упаду, упаду...” ўзнёсла-прасветленымі, гарманічнымі, як гаючы для медытатыўнай паэтавай душы ўтульна абжыты нацыянальны космас.

У зборніку “Міннае поле” пабольшала філасофскіх, глыбокіх па самастойны аўтарскі роздум твораў, такіх, як “У мяне адзінае пытанне”, “Калі разведзены масты” (творы аналізуюцца на вобразным, стылявым, жанравым, ідэйна-тэматычным узроўнях).

У трэцім зборніку лірыкі “Пярсцёнак” вылучаюцца творы, абноўленыя сучасным поглядам на праблему паэта і паэзіі: “Смерць мастака”, “У паэтаў ёсць такое права...”, “Незразумелыя вы, геніі...”, “Дабрыдзень, слава!..”, “Так стараўся...”, якія сведчаць пра змененую канцэпцыю адлюстравання рэчаіснасці, узрушаную “адлігай”, пераломна-трывожную паласу жыцця. Асэнсоўваючы ролю паэзіі свайго пакалення, яе асноўныя задачы, аўтар адыходзіць ад стэрэатыпнага разумення значнасці яе эстраднага характару (жыццярадаснасці, бунтарнасці), надае ўласцівае ёй поліфункцыянальнае пазачасавае класічнае значэнне. Паглыбленне асабовага, інтымнага пачатку – яшчэ адна асаблівасць трэцяга зборніка А. Сербантовіча. Інтымная лірыка становіцца больш вытанчанай, пачуццё сталее, яшчэ больш выразна акрэсліваецца асоба аўтара, паэт звяртаецца да паказу ўсёй гамы чалавечых пачуццяў. Невыпадкова вядучае месца ў “Пярсцёнку” пачынае займаць інтымная лірыка. Трыадзінства Паэзія – Жанчына – Муза ўсё больш набывае ў вершах Анатоля Сербантовіча анталагічную аснову. Усмешка абранніцы – цэлы свет, толькі яна здольная нарадзіць новыя радкі, якімі з пакалення ў пакаленне ўслаўляюць боскае пачуццё паэты. Такім бачыцца змест верша “Там пачынаецца паэзія...”. У вершы “Заплачаш. Заломіш рукі...” аўтар робіць амбівалентны акцэнт, і гэты “сацыяльны адыход” у новых вершах зноў жа гучыць просьбай прабачэння перад Жанчынай за міжвольную “здраду”.

Разгляд праблем, звязаных з вывучэннем агульнай эвалюцыі творчасці А. Сербантовіча, дазваляе зрабіць наступныя вывады:

1. Матыў Вялікай Айчыннай вайны і асабліва востра – маральна-этычны займаюць цэнтральнае месца ва ўсёй творчасці мастака слова. Вобраз міннага поля-памяці выступае дамінантай першага матыву, другі матыў канцэнтруе думку на праблемах Сумлення, Дабра, Ачышчэння душы.

2. У непасрэднай сувязі з ідэйна-тэматычнымі пошукамі знаходзіцца і вобразна-выяўленчае майстэрства паэта, якое цяпер арыентуецца на экспрэсіўную шматслойнасць, асацыятыўнасць, неадназначнасць вобразаў, стыль усё часцей набывае адзнакі аналітызму.

3. Больш разнастайнай становіцца жанравая палітра ў яе сучасных мадыфікацыях.

У другім раздзеле – **"СТРУКТУРНА-ВОБРАЗНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВЕРША АНАТОЛЯ СЕРБАНТОВІЧА Ў ПАРАЎНАЛЬНА-ТЫПАЛАГІЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ"** — раскрываецца шматзначнасць катэгарыяльнага паняцця "стыль".

Вывучэнне экспрэсіўнай актуалізацыі лексічных сродкаў мовы, паэтыкі тропаў, вобразнага сінтаксісу, інтанацыйна-рытмічнай арганізацыі, асаблівасцей жанравай будовы творчасці А. Сербантовіча і вызначае ў многім канцэптуальныя параметры дысертацыйнага даследавання.

Параграф **2.1. "Паэтыка тропаў у творчасці А. Сербантовіча і іншых прадстаўнікоў філалагічнага пакалення /універсальная функцыя параўнання/"** прысвечаны даследаванню пытанняў тэарэтычнай і практычнай паэтыкі, прыярытэтных у сучасным айчынным літаратуразнаўстве. У параграфе адзначаецца, што тропы ў сваім комплексе як цэласная мікравобразная сістэма ў многім фарміруюць жанрава-стылявую адметнасць творчасці кожнага мастака слова і ў значнай ступені – самой літаратурнай школы і нават вызначальнага літаратурнага напрамку. Таму нават, здаецца, прыватная праблема частотнасці іх ужывання ўяўляе вялікую цікавасць для даследчыкаў, яе вывучэнне дае магчымасць прыйсці да значных высноў шляхам індукцыі, наблізіцца да новых спасціжэнняў вобразнай сістэмы твора.

Усебаковае варыяцыйна-статыстычнае даследаванне эвалюцыі стылю Анатоля Сербантовіча ў працэсе "мастацкай самаідэнтыфікацыі" ва ўмовах "дыскрэтнага часу" дазваляе выявіць яго адметнасць і пошукавую непаўторнасць. У святле новых уяўленняў аб кантэксце і разглядаецца ў дысертацыі выкарыстанне пісьменнікам параўнання па сваёй анталагічнай прыродзе – аднаго з важнейшых спосабаў характарыстыкі прадмета ці з'явы.

Агульныя тэндэнцыі ўжывання параўнанняў прасочаны з прыцягненнем элементаў варыяцыйнай статыстыкі на трох зборніках паэта. Выкарыстанне аўтарам параўнанняў у "Азбуцы" выглядае наступным чынам: рамантычныя параўнанні складаюць 31%, рэалістычныя – 23%, гіпербалічныя – 11%, аўтарскія – 23%, традыцыйныя (фальклорныя) – 7% з агульнай колькасці. Аўтарскія параўнанні маюць пераважна рамантычны характар. Сумiраванне колькасці рамантычных і блізкіх да іх гіпербалічных і аўтарскіх, а таксама рэалістычных і традыцыйных дае адпаведна лічбы 48 і 23. Такім чынам, статыстыка сведчыць, што пачынаў свой шлях малады паэт як рамантык, з гэтай прычыны рамантычныя стылявыя прыметы маюць яўную перавагу над рэалістычнымі.

У зборніку “Міннае поле” выяўлена ўжо 32 аўтарскія параўнанні, што складае 30%. Аднак пакуль рэалістычных разам з традыцыйнымі параўнаннямі менш, чым рамантычных разам з гіпербалічнымі і аўтарскімі – 43 (39%) супраць 65 (61%) адпаведна.

У зборніку “Пярсцёнак” са 128 выкарыстаных параўнанняў 67 (52%) з’яўляюцца аўтарскімі. Статыстыка пацвярджае думку аб тым, што рамантычная тропіка (92 выпадкі ўжыванняў, што складае 70%) дамінуе над рэалістычнай (39 выпадкаў, што складае 30%).

Агульныя заканамернаці, якія прасочваюцца ў трох зборніках, а значыць, уласцівыя творчасці мастака ў цэлым, прадстаўлены ў выглядзе дыяграм.

Паэт лічыць галоўнай задачу стварэння гарманічнага малюнка жыцця ў цэлым, яго адлюстравання ў цудоўным акаймаванні смелых аўтарскіх параўнанняў.

У параграфе **2.2. “Ідэйна-мастацкая функцыя сучаснай метафары”** разглядаецца ідэйна-мастацкая функцыя метафар у творчасці паэта-наватара. Падлікі ў даследаванні вяліся паводле дыферэнцыяванага разгляду метафар па групах: рамантычныя і рэалістычныя, аўтарскія і традыцыйныя, у тым ліку фальклорныя, і прасочваліся асобна на прыкладах з трох зборнікаў паэта. Абагульнена назіранні параграфа можна прадставіць наступным чынам. У першай кнізе – “Азбука” – А. Сербантовічам выкарыстана: рамантычных метафар – 31%, рэалістычных – 12%, аўтарскіх– 30%, традыцыйных, у тым ліку фальклорных – 28%. Аўтарскія тропы ў большасці рамантычна афарбаваныя. Такім чынам, рамантычныя стылявыя прыкметы маюць перавагу над рэалістычнымі: рамантычныя і аўтарскія тропы фіксуюцца 41 раз, рэалістычныя і традыцыйныя – 27.

Зборнік “Міннае поле” замацаваў стылявыя пошукі, пачатыя А. Сербантовічам у зборніку “Азбука”. Мастак слова самасцвярджаецца ў ім як прыхільнік адметнага мікравобразнага стылю: ён выкарыстоўвае рэалістычныя і рамантычныя метафары, але яўную перавагу аддае апошнім.

У зборніку “Пярсцёнак” 37 рамантычных, 27 рэалістычных, 44 аўтарскія і 16 традыцыйных, у тым ліку фальклорных метафар. У працэнтных адносінах: рамантычных метафар – 30%, рэалістычных – 22%, аўтарскіх – 35%, традыцыйных – 13%. Статыстыка сведчыць пра несумненны рост майстэрства Анатоля Сербантовіча, пошукавую непаўторнасць яго стылю, адметнасць створанай мастаком метафарычнай карціны свету. Статыстычныя дадзеныя ў цэлым пацвярджаюць назіранне і выснову аб тым, што Анатоль Сербантовіч адлюстроўваў сваю эпоху пераважна рамантычна.

Змяншэнне ўдзельнай вагі фальклорных метафар у творчасці паэта ў цэлым дае падставы гаварыць пра тое, што ён належаў да філалагічнага пакалення, генерацыі новых паэтычных арыентацый, адной (хаця і не ўсеагульнай, калі ўлічыць своасаблівасць пошукаў Р. Барадуліна) з адметнасцей яго творчасці была скіраванасць на пазбаўленне ад нятворчага выкарыстання фальклорнай традыцыі. Шмат аўтарскіх метафарычных асацыяцый і параўнанняў, якія пакладзены ў аснову трох паэтычных зборнікаў паэта, выяўляюць “вучобу на

ўзорах" літаратуры Сярэбранага веку і заснаваны на пераламленні і пераасэнсаванні традыцый імажынізму, асабліва яго праяваў у творчасці С. Ясеніна, ранняга Б. Пастэрнака, у маладнякоўцаў У. Хадыкі, Т. Кляшторнага ("Шаша ныраe ў гул і грукат...", "То мора, то бераг, то востраў зялёны..."). Яшчэ адной заканамернасцю лірыкі А. Сербантовіча, выяўленай статыстычным метадам, з'яўляецца паступовае змяншэнне ў ёй агульнай колькасці метафар, назіраецца выразная тэндэнцыя паглыблення мікравобразнасці ў паэтычнай сістэме. Так, калі ў першым зборніку выкарыстоўваецца 70 метафар у 58 творах (121 %), то ў трэцім – 124 са 156 (79%). Такім чынам, калі зборнік "Азбука" па стылявым афармленні ў цэлым і выкарыстанні тропаў у прыватнасці быў блізкі да ранніх зборнікаў Рыгора Барадуліна "Маладзік над стэпам", "Рунець, красаваць, наліваццa!", то стыль "Пярсцёнка" ўжо набліжаецца па сваіх асноўных адзнаках да стылю "паэзіі думкі" Анатоля Вярцінскага. Аднак стыль Анатоля Сербантовіча мае істотныя адрозненні: паэт пазбягае адкрытай нораваапісальнасці, акцэнтаванага дыдактызму.

Такім чынам, ад "Азбукі" да "Пярсцёнка" стыль Анатоля Сербантовіча відавочна мяняўся: станавіўся ўсё больш гарманізаваным, сінтэтычным, у ім спалучаліся рамантычныя і рэалістычныя прынцыпы пісьма пры відавочнай перавазе першых, паступова ўзрастала роля адметнага аўтарскага тропа, слова, выразу, асацыятыўнай вобразнасці; слоўная квяцістасць саступала месца псіхалагічнай культуры думкі пры ашчаднасці карыстання мікравобразным элементам літаратуры.

У параграфе **2.3. "Колеравая функцыя эпітэтаў у творчасці паэтаў-шасцідзесятнікаў"** характарызуецца падбор колераабазначэнняў і іх выкарыстанне ў творчасці паэтаў. Відавочна, што характар функцыянавання колеравых слоў у творы адлюстроўвае своеасаблівасць аўтарскага стылю, яго творчую індывідуальнасць і непаўторнасць бачання свету, а вывучэнне эстэтычнай функцыі колеру на сучасным этапе набывае вялікае значэнне пры даследаванні паэтычна-жывапіснай вобразнасці нацыянальнай паэзіі.



Мал. 1. Зборнік "Азбука"



Мал. 2. Зборнік "Пярсцёнак"

Канцэнтраваная колеравая палітра Анатоля Сербантовіча мае асабліва адметныя індывідуальныя асаблівасці, нясе на сабе выразны адбітак рэальнага і сімвалічнага падыходаў да мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці.

На аснове назіранняў прааналізаваныя колеравыя эпітэты падзелены на наступныя групы: а) эпітэты “светлага” колеру; б) эпітэты “пераходнага” (шэрага) колеру; в) эпітэты “змрочнага” колеру; г) эпітэты “яркага” колеру. Графічна назіранні прадстаўлены ў выглядзе дыяграм (мал. 1, 2).

Праведзены аналіз аўтарскага колераўспрымання засведчыў, што ў двух апошніх зборніках Анатоль Сербантовіч ужо ўспрымаў жыццё як сінтэз кантрастаў светлага і змрочнага, а яго паэзія становіцца больш прагматычнай. За знешняй гармоніяй мастак слова здолеў убачыць дысгармонію, а за дасканаласцю – супярэчлівасць з’яў, у поўнай меры адчуў складанасці рэчаіснасці, яе трагізм, вынікам чаго і стала пераключэнне з ранейшага “маладога” аптымістычнага настрою на трагедыйны. У гэтым бачыцца істотнае адрозненне лірыкі Анатоля Сербантовіча ад лірыкі многіх іншых паэтаў 60-х гадоў. Для доказнасці выказанага тэзісу ў раздзеле прыводзяцца дадзеныя параўнальнага статыстычнага аналізу вершаў паэта з вершамі Я. Сіпакова, Р. Барадуліна, У. Нядзведскага, А. Вярцінскага, В. Макарэвіча: назіраюцца тыпалагічныя сыходжанні карыстання колерам А. Сербантовіча, Я. Сіпакова і В. Макарэвіча. Адрозненне ж заключаецца ў тым, што каларыстыка, напрыклад, паэзіі Я. Сіпакова арыентуецца на культ зялёнага колеру зямлі. Ужыванне колераў паэтамі аднаго пакалення з’яўляецца ўскосным індыкатарам іх індывідуальнага настрою, іх канцэпцыі жыцця (перавагі аптымістычнага ці трагічнага ў ім), а вызначэнне частотнасці ўжывання колераабазначэнняў дае магчымасць устанавіць своеасаблівасць іх індывідуальных стыляў.

У параграфе **2.4. “Паэтычны сінтаксіс як фактар адметнасці творчай індывідуальнасці: праблема тыпалогії”** праведзены статыстычны аналіз выкарыстання паэтам інверсіі як універсальнага сродка сінтаксічнай экспрэсіі, раскоўвання метрыкарытмічных канонаў строгай сілабатонікі паводле сістэматызаваных і зафіксаваных у табліцах назіранняў.

У зборніку “Азбука” ўжыванне інверсіі са значэннем “актыўна значымае дзеянне” складае – 73 выпадкі (59%) і 51 са значэннем “актыўна значымая прымета” (41%); у “Мінным полі” гэтыя віды інверсіі амаль ураўнаважаныя, хаця па-ранейшаму пераважае дзеяслоўная інверсія – 127 (55%) і 106 (45%) адпаведна. У “Пярсцёнку” агульная тэндэнцыя ўзрастання “кампанента дзеяння” ў тэксце атрымлівае сваё далейшае развіццё і праяўляецца максімальна – 194 (65%), у асобных выпадках да 104 (35%).

Дадзеныя статыстыкі сведчаць пра тое, што Анатоль Сербантовіч імкнецца перадаць рух жыцця словам, што аснову яго паэзіі складае дзеянне, актыўным носьбітам якога выступае дзеяслоў і яго формы або субстантывы са значэннем дзеяння, на якое наслойваецца думка. Адбываецца, такім чынам, рух думкі на фоне мастацкага дзеяння. Перавага дзеяслоўнай інверсіі сведчыць і пра актыўнасць аўтарскай пазіцыі, і пра дынамізм яго творчасці ў цэлым, якая фіксуе і перадае дынамічную плынь самога жыцця. Аднак дзеянне ў творы аўтара не поўнасцю пераважае над апісальнасцю, не адмаўляе медытатыўнасці, а таму адбываецца “перапляценне” знешняга і ўнутранага дзеяння з філасафічнасцю. Гэтая рыса ў нечым збліжае стылі А. Сербантовіча і А. Вярцінскага ў цэлым. Лірыка А. Сербантовіча ў плане

выкарыстання інверсій са значэннем "актыўна значымае дзеянне" вельмі розніцца ад паэтычных прыёмаў Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, В. Макарэвіча, У. Нядзведскага, яна бліжэйшая да драматургіі, а не да эпасу.

Інверсіі А. Сербантовіча са значэннем "актыўна значымая прымета" працуюць і на агульны пафас паэзіі мастака слова, фарбуюць яе ў сіні колер (кветкі – сінія, горы – сінія, неба – сіняе, галубятня – сіняя і да т. п.), "падвышаюць" настрой, ствараюць "светлую" каляровую палітру.

Аналіз двух відаў градацыйнай інверсіі засведчыў, што паэзія А. Сербантовіча ад зборніка да зборніка "насычалася" дзеяннем, збліжалася з драматычным родам літаратуры. Гэтымі тыпалагічнымі сыходжаннямі яна блізкая да творчасці У. Караткевіча і А. Вярцінскага.

Разгляд рытарычных фігур – выгукаў, пытанняў, зваротак, іх ролі ў творчасці А. Сербантовіча дапаўняе назіранні пра індывідуальны стыль паэта. Вынікі статыстычнага аналізу твораў з першых трох зборнікаў мастака слова зафіксаваныя ў табліцах. У зборніку "Азбука" найбольш ужывальным стылістычным прыёмам з'яўляецца рытарычны выгук, 25 выпадкаў выкарыстання якога складаюць 42% ад агульнай колькасці рытарычных фігур. Рытарычныя пытанні і звароткі складаюць 16 выпадкаў (27%) і 19 (32%) адпаведна. Перавага выгукаў у першым зборніку сведчыць пра катэгарычнасць меркаванняў і сцвярджэнняў маладога паэта-максімаліста, пра яго імкненне выказацца гучна, адкрыта, напрамую, публіцыстычна, надаўшы большую эмацыянальнасць тэксту, каб тым самым прыцягнуць увагу рэцыпіента.

Рытарычныя пытанні не патрабуюць прамога адказу, але стымулююць эмацыянальную рэакцыю, канцэнтруюць думку, надаюць пісьму паэта дыялогавы характар, а таму яго лірыка і ліра-эпас драматызуюцца, а стыль набывае сінтэтычны (ліра-эпіка-драматургічны) характар.

Параўнальна невялікая колькасць выклічнікавых прыёмаў і змяншэнне ўжывання рытарычных зваротак (10 выпадкаў на ўвесь зборнік "Міннае поле") тлумачыцца тым, што, па-першае, яны не выконваюць такой значнай эмацыянальнай ролі, як выгукі і пытанні, а, па-другое, мастак слова пазбягаў голай рыторыкі.

У трэцім зборніку – "Пярсцёнак" – пабольшала выгукаў, а таму павялічылася экспрэсіўнасць пісьма ў цэлым, стыль паэта набыў высокую ступень публіцыстычнасці. Гэта ў многім тлумачыцца новай тэматыкай: у кнізе значнае месца займаюць вершы-вандроўкі па Поўначы і тайзе – месцах, поўных экзотыкі.

Амаль поўнае знікненне рытарычных зваротак пад канец творчасці – у "Азбуцы" іх – 14, у "Мінным полі" – 10, а ў "Пярсцёнку", самым вялікім па колькасці твораў зборніку, толькі 6 – сведчыць пра тое, што мастак слова адчуваў сябе адзінокім, у нечым страціў веру ў перспектыву далейшага развіцця, трагічна перажываў акаляючую яго нямату і вакуум адчужэння.

Такім чынам, разгляд ролі рытарычных фігур у творчасці мастака слова дазваляе зрабіць наступны вывад: стыль паэта на працягу трох зборнікаў эвалюцыяніраваў ад гучнасці да сцішанай разважлівасці, ад знешняй эфектацыі да медытатыўнасці, ад дыялагічнасці да маналагічнасці.

У параграфе **2.5. “Жанрава-стылявая разнастайнасць творчасці А. Сербантовіча”** лірыка паэта даследуецца з боку жанрава-стылявых адметнасцей. Быў зроблены падлік і прааналізаваны вершы з трох зборнікаў паводле ўмоўнай класіфікацыі па разнавіднасцях лірыкі: апісальна-выяўленчая, апісальна-выяўленчая з элементамі эталагізму, эталагічная, апісальна-выяўленчая з элементамі медытатыўнасці і адкрыта медытатыўная.

У зборніку “Азбука” паэт арыентаваўся на апісанне, прадметнасць, пластычнасць малюнка, а таму жанравая палітра кнігі была блізкая да жанравай палітры эпасу, хоць і не капіравала яе.

У другім зборніку па-ранейшаму на першым месцы застаюцца творы апісальна-выяўленчыя (35), але значна павялічылася колькасць вершаў сінтэтычнага характару: апісальна-выяўленчых з элементамі эталагічнай (24), апісальна-выяўленчых з элементамі медытатыўнай (4) і твораў чыста медытатыўнай лірыкі (14). Падобныя назіранні дазваляюць зрабіць вывад пра паглыбленне аналітызму ў творчасці паэта. А. Сербантовіч імкнуўся засяродзіць увагу грамадскасці на маральна-этычным аспекце жыцця асобнага чалавека і грамадства ў цэлым з мэтай выпраўлення ў ім дысгармоніі. У зборніку “Міннае поле” паэт працягвае паглыбляцца ў суб’ектыўнае “я”, пастаянна пашыраючы яго экзістэнцыяльныя абсягі. Эпізацыя пры гэтым выяўляецца не ў адмаўленні ад уласнага пачуцця, не ў імкненні “зліцца” з часам, а ў складанай трансфармацыі індывідуальнага ў агульначалавечае. Менавіта дзякуючы такой своеасаблівай метамарфозе і становіцца магчымым з’яўленне такіх сінкрэтычных па будове твораў паэта, як “Міннае поле”, “Кастры”, “Голуб устрывожаны, нясмелы...”, “Калі ў парыльню ты улазіш...”, “Даўно не чуў я шолах лісця...”, “Зіма Расіі”, “Пяро на снег маўклівы птушка скіне...”, “Абвал”, “Шаша нырае ў гул і грукат...”, “Адысея даўно пахавалі...” і інш.

Думка, якая праходзіць “двайное” асэнсаванне або “прасвечванне”, непазбежна становіцца аб’ектам вывучэння, што і вядзе яго лірыку да медытатыўнасці, усю паэзію ўзбагачае новымі мастацкімі адкрыццямі, дае магчымасць аўтару свабодна аперыраваць жанрамі, змешваючы іх з адной мэтай – глыбей пранікнуць у таямніцы быцця. Гэта стала адной з прычын павелічэння колькасці апісальна-выяўленчых вершаў з элементамі медытатыўнасці і эталагізму ў зборніку “Міннае поле”, у параўнанні з “Азбукай” іх амаль у тры разы больш. Асноўная тэндэнцыя праявілася і ў тым, што другі зборнік А. Сербантовіча па ідэйнай задуме вылучаецца большай цэласнасцю, філасафічнасцю, а ў відавым плане творы прадстаўлены большай колькасцю жанравых мадыфікацый, найбольш паказальныя з іх – паэмы “Абвал” і “Міннае поле”, вершы “Балада”, “Голуб устрывожаны, нясмелы...”, “Раса скацілася з куста...” і іншыя. З’яўленне ў “Мінным полі” такіх жанраў, як балада і паэма, абумоўлена ў першую чаргу перавагай рамантычнага, узвышанага, гераічнага пафасу ў паэзіі 60-х гадоў (балады Я. Сіпакова), а таксама новымі праграмнымі задумамі аўтара.

Адметнасцю балад А. Сербантовіча з’яўляецца іх сінтэтычны характар. Напрыклад, верш “Шырокія дарогі і вялікія...” адносіцца па жанравых прыкметах да эпіка-лірычнай разнавіднасці балады (паводле класіфікацыі М.І. Мішчанчука),

бо за эпічнай вастрынёй сюжэта выразна прасочваюцца моцнае пачуццё асабістага болю, уласнага перажывання паэтам трасцянецкай трагедыі і жахаў вайны, спачуванне ахвярам, захапленне мужнасцю героя.

У трэцім зборніку А. Сербантовіча “Пярсцёнак” назіраецца змяншэнне колькасці медытатыўных і апісальна-выяўленчых з элементамі медытатыўнасці вершаў, на новым вітку пачынаюць пераважаць творы выяўленча-апісальнага характару. Аўтар, такім чынам, паглыбляе пластычнасць свайго пісьма, вяртаецца да традыцый прадметнай паэзіі, якая абапіраецца на малюнак, на стварэнне цэльных карцін жыцця, але спалучэнне апісальнасці з адзнакамі эталагізму сведчыць пра новы сінтэз выяўленчых і дыдактычных пачаткаў у творчасці А. Сербантовіча. Напрыклад, у вершы “Адысея даўно пахавалі...” маралізатарская ідэя пра неабходнасць захавання жанчынамі вернасці нават ва ўмовах доўгай разлукі, калі губляецца самая апошняя надзея, раскрываецца сродкамі апісальнага, малюнкавага пісьма.

Такім чынам, уся жанравая палітра аднолькава шырока прадстаўлена ў лірычнай творчасці А. Сербантовіча (ода, элегія, балада, санет). Агульнай адметнасцю яго творчасці становіцца працэс жанравых мадыфікацый як адбітак агульнай тэндэнцыі ўзаемапранікнення асаблівасцей лірыкі, эпасу і драмы, іх сучаснай жанрава-родавай дыфузіі. Анатоль Сербантовіч адносіцца да ліку тых аўтараў, якія передвызначылі з’яўленне сінтэтычных жанраў – прыкметы сучаснай паэзіі. Апісальны, эталагічны і медытатыўны стылі адпавядаюць тром апісаным жанравым сістэмам паэзіі мастака слова.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Паэзія канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя характарызавалася прагай абнаўлення зместу і формы праз актыўнае пераадоленне раней уласцівых ёй ілюстрацыйнасці і спрошчанасці ў перасатварэнні жыццёвых з’яў у мастацкую рэальнасць. У гэты час значна ўзрастае творчая актыўнасць мастакоў слова і больш адкрытым, выразным, акрэсленым робіцца іх разуменне задач словатворчасці. Новы філасофскі ракурс набывае інтэрпрэтацыя праблемы “чалавек і грамадства”, якая раскрываецца ў рэчышчы сусветнай гуманістычнай традыцыі, заснаванай на нязменным культе ідэі свабоды, незалежнасці асобы, што адбіваецца на паскораным станаўленні саміх творчых індывідуальнасцей [7, 6, 12].

Літаратура другой паловы XX стагоддзя характарызуецца разнастайнасцю плыняў, стыляў і жанраў, іх своеасаблівай плюралістычнасцю. У паэзіі перыяду “адлігі” асабліва выразна выявілася рамантычная жанрава-стылявая тэндэнцыя, якая стала неабходным элементам тагачаснай літаратурнай сітуацыі, шмат у чым прадвызначыла напрамкі паэтычных пошукаў А. Сербантовіча ў коле творчага спаборніцтва многіх яго равеснікаў [8 – 11, 14 – 16].

2. Адной з вядучых асаблівасцей літаратурнага працэсу канца 50-х – 60-х гадоў стала імкненне майстроў слова ў сваёй творчасці да аналітычна-філасофскага паказу рэчаіснасці, якое было выклікана не толькі пашырэннем

аб'екта мастацкага адлюстравання, выхадам мастацтва слова за межы сацыяльна-вытворчай тэматыкі, але і паглыбленнем псіхалагізму ў ім, што ў сваю чаргу прыводзіла да большай акрэсленасці і лаканізму ў выяўленні паэтамі сваіх пачуццяў, мастацкі вобраз станавіўся больш "рэчыўным", канкрэтным, адбываліся жанравыя зрухі ў слоўным мастацтве – вызначальныя рысы літаратурнага развіцця ў 70–80-я гады XX стагоддзя [2, 5].

3. Творчасць Анатоля Сербантовіча як цэласная мастацкая сістэма знаходзіцца ў непарыўнай сувязі з эпохай, асабліва адкрытай да грамадскіх перамен жыцця. Лірычны герой яе – Асоба неардынарная, адкрытая, сумленная, якая востра адчувае пакліч часу, канфлікты рэчаіснасці. Неадпаведнасць слова і справы ў грамадстве выклікалі раздвоенасць душы паэта і яго героя, таму ад першага ("Азбука") да апошняга ("Пярсцёнак") зборніка назіраецца нарастанне трагедыйнага пафасу, што непасрэдна адбілася на жанрава-стылявым абліччы яго паэзіі, цэнтральнай побач з агульнаграмадзянскай становіцца і тэма Вялікай Айчыннай вайны і яе маральна-этычнае асэнсаванне з сучасных філасофскіх пазіцый. Паэт выказвае спачуванне звычайнаму чалавеку і засяроджвае ўвагу на традыцыях сусветнага рамантычнага мастацтва, што прыводзіць да пэўных змен у светапоглядных установках паэта, адпаведным чынам уплывае на вобразна-выяўленчую спецыфіку яго творчасці [2, 5, 6, 13].

4. Востра рэагуючы на разнастайныя праявы навакольнага жыцця, А. Сербантовіч заўсёды імкнецца да стварэння паўнакроўнай мастацкай карціны свету, да ўсебаковага раскрыцця і перадачы складанага эмацыянальнага і інтэлектуальнага стану лірычнага героя. Праведзены сістэмна-статыстычны аналіз тропаў паэта сведчыць, што ад "Азбукі" да "Пярсцёнка" яго стыль відавочна мяняўся: станавіўся ўсё больш сінтэтычным (пачуццёва-канкрэтным), спалучаў у сабе рэалістычныя, рамантычныя і часткова мадэрнісцкія прынцыпы пісьма, з яўнай перавагай двух апошніх. Галоўнай для паэта стала скіраванасць на адлюстраванне свету сродкамі ўскладненай мікравобразнасці (аўтарскія "неапараўнанні"), а вызначальным фактарам падобнай трансфармацыі выходзіць на першы план грамадска-сацыяльны, народжаны стратай ілюзій аб хуткай гарманізацыі чалавека і яго адносін з грамадствам. У творчасці А. Сербантовіча назіраецца паступовае ўзрастанне ролі адметнага аўтарскага тропа, слова, выразу, асацыятыўнай вобразнасці. Падобным быў рух паэзіі В. Макарэвіча і Я. Сіпакова, у большай ступені захапляўся эмацыянальным, метафарычным пісьмом Р. Барадулін, больш аналітычнымі станавіліся А. Вярцінскі, У. Нядзведскі, якія прадстаўлялі нашу "паэзію думкі" ў перыяд "адлігі" [1, 3].

5. Адметнасцю стылю А. Сербантовіча паводле колераабазначэння з'яўляецца дамінаванне сіне-белых фарбаў як вынік рамантычнага светаўспрымання паэта. Стылістычная мнагазначнасць і сэнсавая ёмістасць сіняга і іншых колераў у паэтычнай сістэме мастака слова дазваляе гаварыць пра яе амбівалентны сінкрэтызм, але менавіта сіні колер у многім вызначае яе характарыстычную асаблівасць, звязаную з беларускай нацыянальнай ментальнасцю. На стылі мастака адбілася абвостранае ўспрыманне

рэчаіснасці, што ў сваю чаргу вызначыла раскаваную асацыятыўнасць мыслення, надзвычай пашырыла вобразную палітру, аб'яднала знешняе і ўнутранае, рэчыўнае і абстрактнае ў мастацкім свеце паэта. Адзначаныя рысы манеры пісьма А. Сербантовіча пацвярджаюцца адносна гарманічным спалучэннем цёмнай і светлай колеравасці ў другім і трэцім зборніках паэта – "Міннае поле" і "Пярсцёнак" [1, 3].

6. Сістэма паэтычнага сінтаксісу А. Сербантовіча са свайго боку сведчыць пра тое, што ад зборніка да зборніка стыль паэта эвалюцыяніраваў ад гучнасці да паціпэння, ад знешняй эфектацыі да медытатыўнасці, ад дыялагічнасці да маналагічнасці. Гэта яскрава праявілася ў характары выкарыстання інверсій, рытарычных фігур, такіх як выгукі, пытанні, звароткі. Інверсія ў паэзіі А. Сербантовіча сузалежная ад "актыўна значымага дзеяння" і з'яўляецца адной з дамінантных стылістычных адзнак яго творчасці. Амаль поўнае знікненне рытарычных зваротак у апошнім зборніку сведчыць пра настрой і адчуванне адзіноты, беспрытульнасці ў свеце лірычнага героя, пра трагічны разлад, які адбываўся і ў душы самога паэта. Сказанае можна адрасаваць і старэйшым і больш вопытным шасцідзесятнікам – У. Караткевічу і А. Вярцінскаму [1, 11].

7. Рухомасць жанраў і жанравых формаў – праявы вілавочныя ў творчасці прадстаўнікоў філалагічнага пакалення. Іх пастаянная трансфармацыя – працэс заканамерны і няспынны. Як слушна адзначае А. Яскевіч, "жанр ... уяўляе сабой закончаны, завершаны стыль, "зацвярдзелы" на нейкіх вузлавых і агульных структурных момантах формы, прынцыпы якой кананізуюцца і становяцца літаратурнай традыцыяй"[1]. Жанравая палітра ў яе дынаміцы, зменах шырока прадстаўлена ў лірычнай творчасці мастака-наватара, у выкананні якога ода, элегія, балада, санет набываюць сучасныя разнастайныя мадыфікацыі. Асноўнай тэндэнцыяй жанравага руху ў творчасці А. Сербантовіча становіцца яе імкненне да жанрава-родавага сінтэзу, да ўзаемапранікнення, дыфузіі элементаў лірыкі, эпасу і драмы, што абумоўлена складанасцю грамадскіх абставін жыцця ў цэлым, імкненнем паэта шматгранна, глыбока раскрыць чытачу-рэцыпіенту свой унутраны свет, "упісаць" яго ў кола пераважна драматычных, трагедыйных абставін [1, 4]. Такі самы працэс назіраўся ў творчасці Я. Сіпакова, Р. Барадуліна і іншых аўтараў.

Такім чынам, лірыка Анатоля Сербантовіча з'яўляецца рухомай, актыўнай, дынамічнай з'явай у беларускай паэзіі канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя, акумулюе ў сабе лепшыя традыцыі папярэднікаў і працягвае ўплываць на сучаснае мастацтва слова.

---

[1] Яскевіч А. Грані майстэрства. – Мінск.: Маст. літ., 1974. – С. 69.

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных часопісах**

1. Лапацінская В. В. Паэзія Анатоля Сербантовіча: да праблемы індывідуальнага стылю // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2003. – №3. – С. 79 – 83.

2. Лапацінская В.В. Герой паэзіі 60-х гадоў ХХ стагоддзя // Изв. Гомел. гос. ун-та. – 2004. — № 5.– С. 63 – 67.

3. Лапацінская В.В. Ідэйна-мастацкая функцыя тропаў у творчасці А.Сербантовіча (на прыкладзе метафары) // Весн. Віцеб. дзярж. ун-та. – 2004. – №4. – С. 77 – 83.

4. Лапацінская В.В. Паэзія 60-х гадоў: жанрава-стылявы рух // Весн. Брэсц. дзярж. ун-та. – Сер. філалаг. навукі. – 2005. – № 2.– С. 18 – 25.

**Матэрыялы канферэнцый**

5. Лапацінская В.В. Пашыраць даляглядьі... Пра лірыку Анатоля Сербантовіча: назіранні і рэкамендацыі // Традиционное и новаторское в преподавании литературы в школе и вузе: Материалы междунар. науч. конф., 20-21 нояб. 2001 г.: В 2 ч. / Брест. гос. ун-т; Редкол.: М.Н. Жигалова и др. – Брест, 2002. – Ч. 2. – С. 8 – 11.

6. Лапацінская В.В. Асоба і час паводле ранняй лірыкі Анатоля Сербантовіча (канец 50-х – пачатак 60-х гг. ХХ стагоддзя) // Итоги НИР – 2001: Тез. Докл. VI (51) науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов: Доп.; / Рэдкал.: В.І. Несцяровіч, Г.А. Арцямёнак, В.І. Русілка, В.Ю.Бароўка. – Витебск: Изд-во Витеб. гос. ун-та, 2002. - С. 11 – 16.

7. Лапацінская В.В. Аркадзь Куляшоў і Анатоль Сербантовіч // Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. “Творчасць А.Куляшова і адукац.-асветніц. праблемы сучаснасці”, 6-7 лютага 2002 г. / Агул. рэд. М.І. Мушынскі. – Магілёў: Выд-ва Магілёўс. дзярж. ун-та, 2002. – С. 98 – 100.

8. Лапацінская В.В. Творчество Анатолия Сербантовича в контексте белорусского романтизма XIX – XX столетий // Мир романтизма: Материалы междунар. науч. конф. “Мир романтизма” (X Гуляевских чтений), Тверь, 12-15 сент. 2002 г. / Под ред. И.В. Карташовой. – Тверь: Твер. гос. ун-т, 2002. – Вып. 7. – С. 283 – 289.

9. Лапацінская В.В. Чалавек і грамадства ў творчасці Янкі Купалы і Анатоля Сербантовіча // Янка Купала і Якуб Колас у кантэксце славянскіх літаратур: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэтыч. канф., Мінск, 3-4 кастр. 2002 г. / Рэдкал.: У.В. Гніламёдаў (гал. рэд.) і інш. – Мінск.: Беларус. навука, 2002. – С. 63 – 66.

10. Лапацінская В.В. Засваенне рамантычных традыцый Янкі Купалы Анатолем Сербантовічам // Янка Купала і еўрапейскі літаратурны працэс: VI Міжнар. Купалаўс. чытанні – навук. канф. Мінск, 4-5 ліп. 2002 г. / Уклад. А. Бурбоўскай; Рэдкал.: В. Рагойша, І. Багдановіч, Ж. Данкюнас. – Мінск.: Беларус. кнігазбор, 2003. – С. 196 – 200.

11. Лапацінская В.В. Рамантычныя сродкі выразнасці ў паэзіі А.Сербантовіча // VII Рэспубліканская канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларусі (НДРС 2002), Наваполацк, 20-21 лістапада 2002 г. У 5 ч. Ч. II. Раздзел № 4. – Наваполацк, 2003. – С. 19 – 20.

12. Лапацінская В.В. Купалавы традыцыі (на прыкладзе паэзіі канца 50-х—60-х гадоў XX стагоддзя) // Наша класіка: традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе: Матэрыялы рэсп. навук. канф., 23-24 снеж. 2002 г. / Пад агул. рэд. М.І. Мішчанчука. – Брэст: Брэсц. дзярж. ун-т, 2003. – С. 58 – 61.

13. Лапацінская В.В. Эксперыментальны пошук у галіне версіфікацыі Максіма Танка і Анатоля Сербантовіча: пытанні вобразнасці і паэтыкі // Наша класіка: традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе: Матэрыялы рэсп. навук. канф., 23-24 снеж. 2002 г.: У 2 ч. / Пад агул. рэд. М.І. Мішчанчука. – Брэст: Брэсц. дзярж. ун-т, 2003. – Ч. 2. – С. 97 – 101.

14. Лапацінская В.В. Рамантычныя тэндэнцыі ў рускай і беларускай паэзіі 60-х гадоў XX стагоддзя // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія: Матэрыялы VI міжнар. навук. канф: У 2 ч. / Пад агул. рэд.: Л.М.Вардамацкага, Г.М. Мезенкі. 15-17 мая 2003 г. – Віцебск: Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2003. – Ч. 2. – С. 144 – 146.

15. Лапацінская В.В. Праблема наяўнасці рамантычнай тэндэнцыі ў літаратурным працэсе 60-х гадоў XX стагоддзя // V межвузовская научно-методическая конференция молодых учёных, 29-30 мая 2003 года: Сб. материалов: В 2 ч. / Брест. гос. ун-т; Под общ. ред. А.А. Горбацкого. – Брест, 2003. – Ч. 2. – С. 172 – 173.

16. Лапацінская В.В. Рамантычная тэндэнцыя ў паэзіі 60-х гадоў XX ст. // Ян Баршчэўскі ў славянскім свеце (да 210-годдзя з дня нараджэння): Зб. навук. арт. удзельнікаў IV Міжнар. чытанняў, 18-19 мая 2004 г. / Пад рэд.: В.І. Русілкі, В.Ю.Бароўкі. – Віцебск: Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2004. – С. 45 – 49.

# РЭЗЮМЕ

## ЛАПАЦІНСКАЯ ВОЛЬГА ВІКТАРАЎНА

## Творчасць Анатоля Сербантовіча ў паэтычным кантэксце канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя: вобразна-стылявая эвалюцыя

*Ключавыя словы*: літаратурны працэс, філалагічнае пакаленне, эвалюцыя творчасці, стыль, паэтыка, тропы, параўнанне, метафара, колеравая функцыя, паэтычны сінтаксіс, інверсія, рытарычныя фігуры, род, жанр, жанрава-стылявы рух, элегія, балада.

*Аб'ект даследавання* – творчасць Анатоля Сербантовіча ў кантэксце набыткаў паэзіі другой паловы XX стагоддзя.

*Прадмет даследавання* – творчая індывідуальнасць і жанрава-стылявая сістэма А.Сербантовіча (на матэрыяле зборнікаў паэта "Азбука", "Міннае поле", "Пярсцёнак") у кантэксце творчых здабыткаў паэтаў філалагічнага пакалення (Р. Барадуліна, А. Вярцінскага, Я. Сіпакова, У. Караткевіча, В. Макарэвіча і інш.).

*Мэта даследавання* – раскрыццё эвалюцыі творчасці Анатоля Сербантовіча ў літаратурным працэсе канца 50-х – 60-х гадоў XX стагоддзя, на аснове новаўведзеных матэрыялаў, узнаўленне цэласнай карціны жыцця і творчасці паэта, выяўленне ідэйна-тэматычнай, жанрава-стылявой і мікравобразнай адметнасці яго паэтычнай спадчыны.

*Метады даследавання* – функцыянальна-гістарычны, тыпалагічны, герменеўтычны, прыём статыстычнага аналізу.

*Навуковая навізна атрыманых вынікаў:* жанравыя і вобразна-стылявыя асаблівасці паэзіі Анатоля Сербантовіча ўпершыню сталі прадметам цэласнага манаграфічнага навуковага вывучэння. У працы творчасць мастака слова паказваецца як значны складнік агульных поспехаў і дасягненняў пісьменнікаў-шасцідзесятнікаў. Упершыню грунтоўна даследавана паэтыка жанраў, колерасінестэзія, тропіка і рытміка-інтанацыйная структура творчасці паэта праз тыпалогію сыходжанняў мастацкіх пошукаў яго равеснікаў.

Вынікі дысертацыйнай працы маюць навуковае і практычнае значэнне для літаратуразнаўцаў пры даследаванні пераходнага перыяду канца 50-х – 60-х гадоў XX ст. у гісторыі беларускай літаратуры для актывізацыі распрацовак у галіне жанравай і мікравобразнай структуры паэзіі, могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы лекцый і практычных заняткаў, спецкурсаў і спецсемінараў, пры напісанні дапаможнікаў і падручнікаў для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і інш.

# РЕЗЮМЕ

## ЛАПАТИНСКАЯ ОЛЬГА ВИКТОРОВНА

### Творчество Анатолия Сербантовича в поэтическом контексте конца 50-х – 60-х годов XX столетия: образно-стилевая эволюция

*Ключевые слова:* литературный процесс, филологическое поколение, эволюция творчества, стиль, поэтика, тропы, сравнение, метафора, цветовая функция, поэтический синтаксис, инверсия, риторические фигуры, род, жанр, жанрово-стилистическое движение, элегия, баллада.

*Объект исследования* – творчество Анатолия Сербантовича в контексте достижений поэзии второй половины XX столетия.

*Предмет исследования* – творческая индивидуальность и жанрово-стилевая система А.Сербантовича (на материале сборников поэта «Азбука», «Минное поле», «Перстень») в контексте творческих достижений поэтов филологического поколения (Р. Бородулина, А. Вертинского, В. Короткевича, Я. Сипакова, В. Макаревича и др.).

*Цель исследования* – раскрыть эволюцию творчества Анатолия Сербантовича в литературном процессе конца 50-х – 60-х годов XX ст. на основе нововведенных материалов воспроизвести целостную картину жизни и творчества поэта, выявить идейно-тематическую, жанрово-стилевую и микрообразную особенность его поэтического наследия.

*Методы исследования* – функционально-исторический, типологический, герменевтический, приём статистического анализа.

*Научная новизна полученных результатов*: жанровые и образно-стилистические особенности поэзии Анатолия Сербантовича впервые стали предметом целостного монографического научного изучения. В работе творчество мастера слова показывается как значительная составляющая общих успехов и достижений писателей-шестидесятников. Впервые глубоко исследована поэтика жанров, цветосинестезия, тропики и ритмико-интонационная структура творчества поэта посредством сравнительной типологии схождений художественных исканий его равесников.

Результаты диссертационного исследования имеют научное и практическое значение для литературоведов при изучении переходного периода конца 50-х – 60-х годов в истории белорусской литературы для активизации дальнейших разработок в области жанровой и микрообразной структуры поэзии, они могут быть использованы для подготовки лекций и практических занятий, спецкурсов и спецсеминаров, при написании пособий и учебников для высших и средних специальных научных заведений и др.

## SUMMARY

**LAPATINSKAYA OLGA VIKTOROVNA**

### The works of Anatoliy Serbantovich in the poetic context of the late 50's – 60's of the 20th century: imagery and stile evolution

*Key words*: literary process, philological generation, development of literary talent, style, poetic techniques, trope, comparison, metaphor, connotative function, poetic syntax, inversion, rhetorical figures, gender, genre, genre-stylistic movement, elegy ballad.

*Object of research*: works of Anatoliy Serbantovich in the context of poetic achievement in the second half of the 20th century.

*Subject of research*: creative individuality and genre-stylistic system of Serbantovich (on the material of his collections "The ABC", "Shell field", "Ring") in the context of literary achievement of poet from philological generation (Borodylin, Vertinskiy, Korotkevich, Sipakov, Makarevich and others).

*Aim of research* is to reveal the evolution of Serbantovich literary works in the literary process in the late 50's – 60's of the 20th century, to reproduce the integral portrayal of poet's life and literary works on the basis of innovative material, to indicate the thematic, stylistic peculiarities and peculiarities connected with the minor characters of his poetic legacy.

*Methods of research* – functional historic method, philological method, germenephtic method, method of statistic analysis.

*Scientific freshness of the received results*: the peculiarities of genres and style of Serbantovich poetry have become for the first time the subject of integral monographic scientific research.

In this works the literary legacy of master of word is shown as a significant part of general success and achievement of the poesy of the 60's. Profound research of poetic genre techniques, the synthesis of different connotations, tropes and rhythm and intonation structures of poet's works have been conducted for the first time on the basis of comparative typology of creative searches of his contemporaries.

The results of this thesis have scientific and practical significance for the literary experts in the process of studying the transition period of late 50's – 60's in the history of Belarusian literature, they are also very important for the launching of other research in the sphere of genre and minor character system of poetry. They may be used for the preparation for lectures and practical classes, special courses and seminars, while writing different text books and additional materials for higher and secondary educational establishments.

Падпісана ў друк 3.10.2005. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,40. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 100 экз. Заказ 111.

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава"
Ліцэнзія ЛВ № 02330/0056790 ад 1.04.2004.

Надрукавана на рызографе установы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава"
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.